# Школьная планета

**НЕ БУДЗЬ ЧУЖЫНЦАМ НА СВАЁЙ ПЛАНЕЦЕ! № 1 (31)Верасень 2016**

*Выданне ДУА “Сярэдняя школа № 2 горада Беразіно”Мінскай вобласці*

**БЫВАЙ ГАМАНЛІВАЕ ЗВОНКАЕ ЛЕТА!**
**НЯСЁМ МЫ У КЛАСЫ ВЯСЁЛКІ БУКЕТАЎ.**
**МЫ БОР АБУДЖАЛІ ГАМОНКАЙ ВЯСЁЛАЙ.**
**БЫВАЙ, ЛЕТА ЗВОНКАЕ! КРОЧЫМ МЫ Ў ШКОЛУ.**
**П. ПРАНУЗА**






*Раніцою залацістай*
*У клас мы радасна ідзём.*
*Там утульна, светла,*
*чыста.*
*Школа – наш любімы дом.*
*Я. Журба*








***Фота Ірыны Маркевіч***

Дом, у якім утульна ўсім!

berezino2.school.by vk.com/club59543714 № 31, верасень 2016 г.

Знакамітыя выпускнікі

# Песня Палесся

**ДЗМІТРЫЙ ІВАНАВІЧ АЛЕЙНІК**

**(1929 - 2003)**



***Дзмітрый Алейнік – адзін з заснавальнікаў гомельскай школы жывапісу. Яго пэндзлю падпарадкоўваліся трапяткія, амаль няўлоўныя станы прыроды. Мастак умеў перадаць рух ветру, пробліск першых прамянёў сонца і пры гэтым захаваць цэласнасць агульнага стану прыроды, яе натуральнасць. Для яго самым важным і патаемным ў творчым працэсе былі непасрэдныя зносіны з прыродай, назіранне за ёй, адлюстраванне яе праяў і станаў. З дзіцячых гадоў закаханы ў прыроду роднай Беларусі, Дзмітрый Іванавіч пранёс гэтую любоў праз усю сваю творчасць, захаваў блізкасць да народнага мастацтва.***

У 2009 годзе *мастаку, заслужанаму дзеячу мастацтваў БССР (1981), члену Саюза мастакоў СССР* Дзмітрыю Іванавічу Алейніку споўнілася б 80 гадоў. У гомельскім палацы Румянцавых і Паскевічаў была адкрыта юбілейная выстава ў памяць аб гэтым выдатным майстры.

У экспазіцыі было прадстаўлена 40 работ у жанры лірычнага пейзажу, выкананых мастаком у 1960-80-я гады мінулага стагоддзя.

*На выставу «Песня Палесся»* сям'я мастака прадставіла 30 карцін майстра. Адну працу - «Дворык у вёсцы Дзявошычы», напісаную Дзмітрыем Алейнікам у 1997 годзе, сям'я падарыла музею.

Д. І. Алейнік нарадзіўся 13 верасня 1929 года ў пасёлку Беразіно, які раскінуўся на маляўнічым беразе ракі Бярэзіна. Тут прайшло дзяцінства будучага мастака.

Дзмітрый быў старэйшым у сям'і, і яму прыходзілася больш, чым іншым дзецям, дапамагаць бацьку - столяру і майстру на ўсе рукі. Разам яны рабілі цацкі, канькі, лыжы і нават драўляны ровар. Перад тым, як што-небудзь рабіць, даводзілася замалёўваць, мабыць, тады ўпершыню і выявілася ў хлопчыка здольнасць да мастацтва.

*(Заканчэнне на 3 старонцы)*



Дом, у якім утульна ўсім!
berezino2.school.by vk.com/club59543714 № 31, верасень 2016 г.

(Заканчэнне. Пачатак на 2 старонцы)

*У 1949 годзе* Дзмітрый паступіў у Мінскае мастацкае вучылішча, затым працягваў мастацкую адукацыю ў Беларускім тэатральна-мастацкім інстытуце. Ён вучыўся ў *Валянціна Віктаравіча Волкава* (прафесар, Народны мастак Беларусі, Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі) і *Віталя Канстанцінавіча Цвірко* (беларускі савецкі жывапісец і педагог, выпускнік Маскоўскага дзяржаўнага інстытута ім. В. І. Сурыкава, Народны мастак БССР, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР.

*Прыехаў ён на Гомельшчыну ў 1960 годзе* і актыўна ўключыўся ў творчы працэс. Працаваў у галіне станковага і манументальнага жывапісу. Д. І. Алейнік шмат ездзіў па Беларусі, рабіў замалёўкі, пісаў эцюды, партрэты, тэматычныя карціны. Асноўным жанрам у яго творчасці быў пейзаж.

Уменне ўбачыць прыгожае ў навакольнай прыродзе і адлюстраваць гэта ў сваіх палотнах - гэта найвялікшы дар. Гэтым дарам валодаў Алейнік Дзмітрый Іванавіч.



У Алейніка свой характэрны почырк. Ён пісаў дробнымі, мяккімі мазкамі. Мастак выкарыстаў прыёмы «пуантылізму».

Пейзажы Алейніка эмацыйныя і глыбокія ў сваёй філасофскай канцэпцыі. Пейзаж шмат у чым вызначае творчасць майстра. А сама прырода - гэта быццам бы тая музыка, якая дорыць мастаку натхненне для працы. На яго палотнах «загаварылі» бярозавыя гаі і дубровы над ракой Убарць, блакітныя азёры Браслаўшчыны, лясныя паляны Мядзельшчыны. З гадамі Дзмітрый Алейнік выпрацоўваў сваю манеру ліста, у якой фарбы нагадваюць россып жэмчугу.

У яркай каляровай гаме напісаны пейзажы: «Стагі», «Бярозкі», «Восень у лесе», «Вясенні матыў», «Касавіца» і інш. Мастак умела спалучае колеры. Халодныя фарбы асабліва добра гучаць на фоне цёплых таноў і наадварот.

*З 1961 года* працы беларускага пейзажыста экспанаваліся на абласных, рэспубліканскіх, усесаюзных выставах, а таксама ў Польшчы, Германіі, Чэхаславакіі, Італіі, Алжыры, Тунісе, Фінляндыі і іншых краінах. Яго карціны ўвайшлі ў залаты фонд беларускага жывапісу, яны захоўваюцца ў многіх музеях і карцінных галерэях, у тым ліку - музеі «Гомельскага палацава-паркавага ансамбля».



У сям'і Алейніка - дзве дачкі Вераніка і Святлана, шэсць унукаў. Дзве дачкі і дзве ўнучкі пайшлі па слядах бацькі і дзеда.

Любая выстава мастака - гэта дыялог з гледачом. Гэта дыялог радасны і жыццесцвярджальны.

***Спяць дамы на бялюткім абрусе.***
***Першы снег, быццам першы ўздых.***
***Чысты подых маей Беларусі***
***Ты у марах плывеш веснавых. (Мікалай Макарцаў)***

***Матэрыял падрыхтавала Н. С. Міхалёва***

# Нататкі матацыкліста

Нашы з татам паездкі пачаліся з яго прапановы пракаціцца спачатку па раёне, а затым па іншых абласцях і гарадах. Усе хочуць паехаць за мяжу, паглядзець свет. Мы з татам для пачатку вырашылі спазнаць сваю родную краіну, у якой шмат цікавых памятных месцаў. Ехаць, адчуваць пахі прыроды нашмат цікавей на матацыкле, бо ты зліваешся з навакольным светам, становішся адным цэлым з ім. На мой погляд, седзячы ў машыне, гэта зрабіць куды складаней.

Усе адчуванні, пачуцці не апісаць, гэта трэба бачыць сваімі вачыма.

Адной з першых доўгіх па адлегласці паездак была паездка ў ***Раванічы***. Па дарозе туды, я ўпершыню адзела навушнікі і адчула, як жа класна ехаць і супастаўляць прыроду і музыку.



Стан сядзібы на сённяшні дзень не радуе: няма гаспадара - няма парадку.



Сядзіба займае параўнальна высокую рачную тэрасу, яе палогі, злёгку перасечаны схіл да поймы ракі Уша і саму пойму, у якой ўладкована сістэма штучных вадаёмаў. Палац быў пабудаваны на краі схілу рачной тэрасы. Будынак прамавугольны ў плане, аднапавярховы.

Цікава, што ад тыльнага да параднага фасаду ідзе доўгая галерэя, якая праходзіць увесь будынак наскрозь.



Адметна тое, што з 1952 года па 1971 год у палацы знаходзілася Раванічская сярэдняя школа. У нас жа ў Беразіно ў сядзібе графа Патоцкага таксама калісьці была школа.

На тэрыторыі парку растуць адзіныя ў Беларусі экземпляры белага дуба і клёна серабрыстага.

Я заўсёды з засмучэннем гляджу на такія будынкі і мару пра тое, што калі-небудзь хто-небудзь іх адрамантуе.

***Марыя Власюк, фота аўтара***



# Школа вачыма маладога спецыяліста

## Капанец Таццяна Ігараўна (настаўнік хіміі)



Калі я прыйшла першы раз у клас, то крыху хвалявалася, аднак дзеці вельмі гасцінна і добра прынялі мяне. Гэта было прыемна і дапамагло зблізіцца з імі хутчэй.

Калектыў мяне таксама парадаваў. Адразу ж знайшліся тыя людзі, якія дапамаглі мне ўліцца ў працу: распавялі аб школе, аб дзецях. Дзякуючы іх парадам стала працаваць значна лягчэй.



## Бурымская Ганна Сяргееўна (педагог-арганізатар)

Школа - гэта месца, дзе кожнае дзіця адчувае сябе важным і патрэбным; месца, дзе яму цікава праводзіць час і на ўроках, і пасля іх. Настаўнікі тут гуманныя, да кожнага вучня знаходзяць свой падыход, у кожным імкнуцца абудзіць імкненне вучыцца, чагосьці дабіцца ў жыцці, стаць лепшым, чым быў учора. Школа – месца, куды дзецям хочацца ісці!!!

## Бурцава Вольга Ігараўна (педагог сацыяльны)

Я з дзяцінства марыла стаць настаўнікам. І вось 21 верасня 2016 года я пераступіла парог Дзяржаўнай установы адукацыі «Сярэдняя школа № 2 горада Беразіно». Што ж мяне ўразіла і парадавала? Гэта, безумоўна, прыемны і добразычлівы калектыў, гатовы прыйсці на дапамогу ў любую хвіліну; гэта справядлівы дырэктар школы; і, вядома, спагадлівы тэхперсанал. Так што мая адаптацыя да школы прайшла лёгка і хутка.

## Буцікава Вольга Віктараўна (педагог сацыяльны)



*Старонку падрыхтавала Вольга Жук*

# ЦІКАВЫЯ ФАКТЫ ПРА …




**ГІСТОРЫЯ ГРОШАЙ.** Цяжка сабе ўявіць сучаснае жыццё без грошай. ***Грошы – гэта мера кошту, сродак плацяжу, адна з формаў назапашвання зберажэнняў.*** Пры выкарыстанні грошай вытворца тавару мае магчымасць прадаць свой тавар сёння, а купіць сыравіну, напрыклад, толькі праз тыдзень. Пры гэтым ён можа прадаць свой тавар у адным месцы, а купіць патрэбны яму зусім у іншым. Такім чынам, грошы як сродак звароту пераадольваюць часовыя і прасторавыя абмежаванні пры абмене. Гэта найважнейшае вынаходніцтва чалавецтва, без якога развіццё грамадства было б немагчымым.



***Даволі доўга чалавек абыходзіўся без грошай.*** Многія тысячагоддзі адзіным спосабам атрымаць жаданае служыў просты абмен таварамі або, інакш кажучы, бартэр. Лішкі ўласнай вытворчасці абменьваліся на лішкі, наяўныя ў іншых. Абмен стаў насіць пастаянны, масавы характар, і рынак быў галоўным месцам грамадскага жыцця. Аднак на рынку ўсё часцей ўзнікалі праблемы, якія цяжка было вырашыць. Які кошт адной лыжкі? Ці каштуе конь больш, чым фурманка? Людзям трэба было штосьці больш кампактнае. Некаторы час разнавіднасцямі "грошай" служылі ракавінкі, скуры, тытунь, збожжа, бабы, соль. Але і гэта было не зусім зручна. І вось з VII стагоддзя да нашай эры ў якасці разлікаў сталі выкарыстоўвацца высакародныя металы, золата і срэбра, якія не іржавеюць. ***З каштоўных металаў пачалі рабіць грошы.*** Пазней у залатыя і срэбныя манеты сталі дадаваць розныя металічныя сплавы. І ў выніку кавалачкі металу выцеснілі ўсе астатнія "тыпы грошай". Гэты этап быў самым працяглым.



Асаблівай увагі заслугоўвае паходжанне папяровых грошай. Адкуль з'явіліся папяровыя грошы? Для адказу на гэтае пытанне неабходна зноў звярнуцца да гісторыі.





***Першыя папяровыя грошы з'явіліся ў Кітаі ў 910 годзе нашай эры.*** Металічныя манеты было даволі цяжка перавозіць, таму ўрад задумаўся аб выкарыстанні ў разліках папяровых грошай. Яны сталі плаціць купцам не манетамі, а спецыяльнымі сертыфікатамі, якія лёгка разменьваліся на залатыя або срэбныя манеты. На гэтых сертыфікатах малявалі важных людзей, чыноўнікаў, ставілі свае подпісы і пячаткі. У Еўропу папяровыя грошы, як сведчаць гісторыкі, былі завезены падарожнікамі і першыя папяровыя грошы тут былі надрукаваны ў канцы XVII стагоддзя. У Расіі першыя папяровыя грошы былі ўведзены пры Кацярыне II (1769 год). Называліся яны ***асігнацыямі.*** Але гэта былі не тыя папяровыя грошы, якія мы ведаем цяпер, а даўгавыя абавязацельствы. Цяпер бы мы іх назвалі ***аблігацыямі***. У банку іх можна было абмяняць на медныя манеты.




Калі ж з'явіліся першыя папяровыя грошы на тэрыторыі Беларусі? А пра гэта мы даведаемся ў наступным нумары…

***Матэрыял падрыхтавала Лізавета Вайцяховіч***




# Привет, новенькая!

## Глава I

Была пасмурная погода. Сильный ветер гнул деревья, мелкий дождь оставлял маленькие капли на земле. Наступало утро, но независимо от погоды город начинал своё движение. Уткнувшись носом в окно автобуса, Марина сонными глазами наблюдала за снующими людьми и транспортом. Она следила за каждой машиной, которая проходила мимо автобуса, чтобы отвлечь себя от плохих и тревожных мыслей. Доехав до нужной ей остановки, девочка вышла из автобуса и направилась в свою новую школу.

Зайдя в класс, она увидела двадцать девять пар глаз, которые смотрели на неё. К Марине подошла учительница и представила классу:

- Класс, знакомьтесь, это Марина, ваша одноклассница.

Учительница показала на единственное свободное место и сказала сесть туда. Дойдя до последней парты, Марина увидела мальчика, который сидел спиной к учителю. Девочка села на свободное место и стала раскладывать учебники. Приготовившись к уроку, она повернулась к своему однокласснику.

- Привет, я Марина, а ты кто? – спросила она, улыбнувшись.

Мальчик повернулся и ,тоже улыбнувшись, сказал:

- А… Привет новенькая! Я - Никита. Рад знакомству.

Прозвенел звонок, начался урок литературы. Девочка поняла, что её новый класс очень дружный и спокойный. На уроке она узнала много нового. На перемене Марина вышла в школьный коридор и, встав возле окна, заметила, как поменялась погода: вместо дождя в небе показалась радуга, тучи, нависшие над городом, сменило яркое солнце. К ней подошла девочка с тёмно-каштановыми волосами, которые были красиво заплетены в косу. На ней были красивые синие балетки, чёрная юбочка и модная блузка.

- Погода на удивление изменилась в хорошую сторону. Я - Даша.

Она шутя сделала реверанс в Маринину сторону и засмеялась.

- Марина, – протянув руку, сказала девочка.

Так у Марины появилась новая подруга. Они прошлись по всей школе, рассказывая друг другу разные истории из своей жизни. Им было очень весело, они не заметили, как пролетела перемена.

Зайдя в класс, девочка села за парту, а её новый сосед стал приставать к ней с разными вопросами, которые казались ей смешными. Уроки с её собеседником пролетали очень быстро и весело. Также незаметно пролетел её первый день в школе…

… Марина приехала домой, зашла в свою комнату, бросила портфель возле кровати, уселась поудобнее, открыла свой дневник и начала записывать впечатления о новой школе … «Сегодняшний день в новой школе прошёл на славу! Я познакомилась с мальчиком, который сидит со мной за одной партой, его зовут Никита, он очень весёлый и забавный. Ещё у меня появилась новая подруга по имени Даша, мы с ней каждую перемену ходили по школе, рассказывая смешные моменты из жизни. Нам было весело!!! Надеюсь, что завтра я узнаю гораздо больше о своём классе».

Девочка положила свой дневник на место. Переодевшись, она прилегла на кровать, чтобы немного отдохнуть. Ей приснился сон…



***Анастасия Губич***




*У цяперашні час на тэрыторыі рэспублікі актуальнай праблемай з'яўляецца распаўсюджванне курыцельных сумесяў, якія змяшчаюць у сваім складзе сінтэтычныя канабіноіды.*

Дадзеныя «міксы» рэкламіруюцца як легальны прадукт, які не ўтрымлівае наркатычных сродкаў і псіхатропных рэчываў, што не адпавядае рэчаіснасці. Тым не менш, курыцельныя сумесі атрымліваюць папулярнасць у маладзёжным асяроддзі, продаж іх актыўна вядзецца як пры дапамозе сеткі Інтэрнэт, так і на тэрыторыі ўстаноў адукацыі, у інтэрнатах.

Паводле інфармацыі, атрыманай з медыцынскіх інтэрнэт-сайтаў і навуковых выданняў, ўжыванне «спайсаў» прыводзіць вось да якіх наступстваў:

*1. Лакальныя рэакцыі арганізма, якія ўзнікаюць па прычыне прамога негатыўнага ўплыву дыму на слізістыя арганізма.*

Амаль усе прыхільнікі курыцельных сумесяў пакутуюць ад пастаяннага кашля, маюць хрыплы голас. Пастаяннае ўздзеянне дыму на слізістыя становіцца прычынай развіцця запаленняў дыхальных шляхоў хранічнага характару. Працяглае курэнне такіх сумесяў можа прывесці да развіцця рака гартані, глоткі і лёгкіх.

*2. Рэакцыі цэнтральнай нервовай сістэмы (ЦНС).*

Уплыў інгрэдыентаў дыму на ЦНС абумоўлівае прывыканне да курэння «спайса». З боку ЦНС могуць выяўляцца разнастайныя рэакцыі: неаргументаваная істэрыка, расстройства каардынацыі і арыентавання, візуальныя і слыхавыя галюцынацыі, абсалютная страта здольнасці кантраляваць сябе і свае паводзіны. Могуць назірацца ўстойлівыя парушэнні ўвагі, паслабленне памяці і зніжэнне інтэлекту. Акрамя ўсяго іншага, курцы «спайса» маюць усе шанцы калі не памерці, то стаць інвалідамі па прычыне цяжкіх паражэнняў ЦНС.

*3. Моцная інтаксікацыя арганізма.*

Пры пранікненні з дымам атрутных рэчываў могуць узнікнуць таксічныя рэакцыі - млоснасць, высокія паказчыкі артэрыяльнага ціску, спазмы. Складанасць ў ліквідацыі наступстваў курэння сумесяў «спайс» заключаецца ў тым, што ў многіх выпадках у крыві пацыентаў пры аналізе адсутнічаюць наркатычныя злучэнні, што істотна абцяжарвае дыягностыку і прызначэнне лячэння.

***Матэрыял падрыхтавала Аляксандра Дудко***

ДУА "Сярэдняя школа № 2 горада Беразіно"
223311
вул. Мультана, 19
Электронная пошта
berezinosch2.edu@tut.by
Сайт школы
berezino2.school.by

Газета "Школьная планета" выходзіць адзін раз у месяц.
Творчы калектыў клуба "Юны журналіст": Дудко Аляксандра, Жук Вольга, Вайцяховіч Лізавета, Власюк Марыя, Маркевіч Ірына